

МЕСЦА І ЧАС ДЗЕЯННЯ

ВЯСЁЛЫЯ ГІСТОРЫІ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ 5



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 МАЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 82 (28949)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVпраграма

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Што датычыцца заработнай платы, па апошніх даных за сакавік, мы выйшлі на ўзровень Br1057. Задача — не проста ўтрымаць, а прырастаць кожны месяц. Як ужо паведамлялася, сталіца ў разрэзе рэгіёнаў традыцыйна лідзіруе па гэтым паказчыку: сярэдняя зарплата работнікаў Мінска за сакавік сфарміравалася ў памеры Br1544,5 (тэмп росту да сакавіка 2018 года — 105,9 %). У Мінскай вобласці яна склала Br1051,1 (110,4 %), у Гомельскай — Br930,2 (107,3 %), у Гродзенскай — Br892,7 (108 %), у Брэсцкай — Br892 (107,4 %). Сярэдні заробак у Віцебскай вобласці — Br867 (107 %), у Магілёўскай — Br846,3 (104,4 %). У цэлым па краіне рэальная заработная плата (заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені—сакавіку ў параўнанні з адпаведным перыядам 2018 года ўзрасла на 7,8 %».*

# РОЛЯ АЎТАРЫТЭТНЫХ СМІ

## Па свежыя навіны — у Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа»



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**УЧОРА ў сталічным Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа», што на праспекце Пераможцаў, 14, урачыста адкрылася XXIII Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «СМІ ў Беларусі» — традыцыйнае месца сустрэч супрацоўнікаў айчынных медыя і іх чытачоў, слухачоў і гледачоў.**

### Шанаваць давер аўдыторыі

— Шчыра прадстаўляючы грамадству жыццё ва ўсёй яго разнастайнасці і не хаваючы праблем, СМІ усё ж трэба больш канцэнтравацца на прасоўванні пазітыўнага парадку дня. Не разбураць, але ствараць, — адзначыў **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Цэлыя дзяржавы на розных кантынентах сёння не проста выказваюць заклапочанасць засіллем фэйкавых навін, нянавісці і жорсткасці ў медыяпрасторы, а на заканадаўчым узроўні спрабуюць змагацца з гэтым глабальным злом. Разумеючы яго прыроду, мы адчуваем і тое, што аднымі забаронамі праўду не абараніць, а нянавісць не спыніць. Менавіта ў гэтай сітуацыі як ніколі важная роля прафесійных, аўтарытэтных СМІ. Вы можаце эфектыўна супрацьстаяць гэтай агульнай для розных краін і народаў праблеме. Усё, што для гэтага патрабуецца, — свята ахоўваць прынцыпы журналістыкі і вышэй за ўсё шанаваць давер аўдыторыі — свайго галоўнага рэдактара.

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ЖАЎНЯК** таксама прысутнічаў на ўрачыстым адкрыцці выстаўкі і зачытаў прывітальнае слова кіраўніка краіны. «Паспяховае развіццё прафесійнай журналістыкі з'яўляецца адным з найважнейшых фактараў забеспячэння інфармацыйнага суверэнітэту Беларусі. Захаванне этычных нормаў, прынцыпаў сумленнасці і дакладнасці ў падачы навін, наяўнасць дакладнай грамадзянскай пазіцыі — прыкмета салідных друкаваных і электронных выданняў, тэлевізійных праектаў, якія выклікаюць давер і гатовы супрацьстаяць выклікам сучаснасці», — гаворыцца ў прывітанні.

СТАР. 3



# ВЕТЭРАНАМ АКАЖУЦЬ МАТЭРЫЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ

**У Беларусі па стане на 1 красавіка пражываюць 6250 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 118 ад 28 сакавіка 2019 года ветэранам акажуць аднаразовую матэрыяльную дапамогу. Памер выплат складзе ад 650 і да 2000 рублёў.**

Калі браць канкрэтныя лічбы, то дапамога будзе аказана ў наступных памерах:

2000 рублёў — Героям Савецкага Саюза;

1500 рублёў — інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, асобам, якія прымалі ўдзел у абароне Айчыны да 3 верасня 1945 года, а таксама тым, хто прымаў удзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах;

800 рублёў — работнікам тылу;

650 рублёў — тым, хто пацярпеў ад наступстваў вайны.

Выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі будзе праводзіцца ў перыяд з 1 чэрвеня да 1 ліпеня ў парадку, устаноўленым для выплаты пенсій.

У цэлым атрымальнікамі такой дапамогі стануць амаль 22 тысячы чалавек. На яе выплату ў рэспубліканскім бюджэце прадугледжана 18 млн рублёў.

На сённяшні дзень у жывых засталося толькі два Героі Савецкага Саюза — Васіль Мічурын, якому ў ліпені споўніцца 103 гады, і Іван Кустаў, якому ідзе 96-ы год. Абодва яны пражываюць у Мінску.

**Святлана БУСЬКО.**

## Адкрываючы таленты

Ядвіга ПАПЛАЎСКАЯ:

# «У ПЕСНЯХ ТРЭБА КОЖНЫ РАЗ УКЛЮЧАЦЬ ДУШУ І СЭРЦА»



**У далёкім 1974 годзе беларускі вакальна-інструментальны ансамбль «Верасы» выступіў на Усесаюзным конкурсе артыстаў эстрады (а ў намінацыі «Ансамблі» было каля 40 удзельнікаў!) і не толькі імгненна стаў папулярным, але і пераканаўча пацвердзіў, што не толькі «Песняры» могуць задаць і трымаць самую высокую творчую планку. Манеру распеву і чысціню інтанацыі беларусаў ужо ў першым туры адзначыў не хто-небудзь, а мэтр савецкай эстрады Юрый Сіланцьеў. «Так прыемна, што і сёння, напрыклад, зорка сусветнай оперы Любоў Казарноўская згадала пра гэты факт на адным з тэлеконкурсаў», — гаворыць Ядвіга Паплаўская, чыё імя слухачы дагэтуль атаясамліваюць са знакамітым калектывам.**

**Сёння народная артыстка Беларусі ўжо сама дае пуцёўкі на вялікую сцэну маладым выканаўцам — яе часта запрашаюць у журы беларускіх і міжнародных конкурсаў. Яна можа бясконца і з захапленнем расказваць, якія таленавітыя ў нашай краіне дзеці, якія самаадданыя і творчыя педагогі, а галоўнае — чаму так важна ўдзельнічаць у конкурсах, каб прабіць сабе дарогу «на прастор, на шырокі прастор»...**

СТАР. 4

## КОРАТКА

• 2 мая кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава наведала Спецыялізаваны ліцэй пры Універсітэце грамадзянскай абароны МНС.



• **Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту Беларусі ў 1-м квартале склаў Br0,8 млрд.**

• Зборная Беларусі па хакеі абыграла Славенію (4:1) і атрымала трэцюю перамогу запар на ЧС (дывізіён 2) у Казахстане.

ISSN 1990 - 763X

19082

9 771990 763008

# ПА ПРЫНЦЫПАХ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

## Мы павінны прыгожа, годна і сумленна арганізаваць парламенцкія выбары

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт на сустрэчы са старшынёй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаілам Ордам.**

Перш чым перайсці непасрэдна да пытанняў нарады, кіраўнік дзяржавы нагадаў, што наша краіна знаходзіцца ў шырокім электаральным цыкле — зусім хутка нас чакаюць парламенцкія, а потым і прэзідэнцкія выбары. На думку беларускага лідара, больш арганізаваных і згуртаваных арганізацый, чым нашы прафсаюзы, у Беларусі нічога няма.

«Я не буду хаваць, што я хацеў бы, каб вы, асабліва на стадыі парламенцкіх выбараў, былі больш далучаны да гэтага працэсу. Каб вы дапамаглі і нам на месцах, асабліва ў камісіях», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка і нагадаў, што ва ўчастковых камісіях аснову заўсёды складалі настаўнікі і ўрачы — людзі, якія з'яўляюцца апорай у цяжкіх пытаннях.

«Таму мы вельмі хацелі б, каб у гэтым плане вы аказалі падтрымку мясцовым уладам пры фарміраванні камісій і арганізацыі ўсяго перадвыбарчага працэсу. Больш за тое, я, вядома ж, чакаю прадстаўнікоў прафсаюзаў кандыдатамі ў парламент: і ў Савет Рэспублікі, і ў Палату прадстаўнікоў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта дасведчаныя людзі, людзі з працоўных калектываў, якія маглі б працаваць у парламенце».

«А ад перадвыбарчай кампаніі далёка не адыходзьце, разам з грамадскімі арганізацыямі, органамі ўлады. Дзесьці партыі будуць падключацца да гэтага працэсу — незалежна ад таго, апазіцыйныя яны ці, як у нас прынята казаць, праўладныя. Мы павінны прыгожа, годна і сумленна арганізаваць гэты працэс. Несумленна не трэба», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Беларускі лідар дадаў, што цяпер не тая сітуацыя, каб рабіць нейкія незразумелыя крокі і потым падвяргацца крытыцы.

Другое пытанне на парадку дня — цэнаўтварэнне.

«Я пра гэта казаў і калісьці вас прасіў трымаць у полі зроку. Вы абараняеце перш за ўсё, як вы сябе пазіцыянуеце, інтарэсы працоўных, нашых людзей, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Зацікаўленасць жа ў цэнаўтварэнні — самая прамая, не такія багатыя ў нас людзі, каб купляць па шалёных цэнах тую ці іншую прадукцыю, асабліва якая вырабляецца ў нас: прадукты харчавання, адзенне і іншае».

Гэтае пытанне вельмі важнае для нашых ветэранаў і пенсіянераў, упэўнены Прэзідэнт. «Яны ж за імпартам не ганяюцца. А ўсё, у што яны апранаюцца, і тое, што яны ядуць, робіцца ў Беларусі. І якая будзе цана гэтых тавараў і прадуктаў, залежыць шмат і ад нас. Таму я прасіў пракантраляваць, прытым стварыць сістэму — стройную, выразную — і кантраляваць цэны ў Беларусі. Як тут ідуць справы? І чаму людзі пастаянна звяртаюць нашу ўвагу пры любых сацыялагічных апытаннях на гэтую праблему? Гэтая праблема ў шэрагу першых», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

* * *

Па выніках сустрэчы з беларускім лідарам Міхаіл Орда пагутарыў з журналістамі.

Паводле яго слоў, Прэзідэнт даручыў у найбліжэйшы час сабраць на нараду ўсіх тых, хто мае дачыненне да цэн, каб выпрацаваць дакладныя падыходы па цэнаўтварэнні. Прэзідэнт падкрэсліў, што «ніхто не мае права нажывацца на кішэнях людзей».

Як адзначыў Міхаіл Орда, рост коштаў не павінен быць звязаны з ростам пенсій і заробкаў. Трэба, каб быў дакладны механізм адсочвання, каардынацыі, не было разрозненасці паміж ведамствамі. На думку прафсаюзаў, кантроль павінна ажыццяўляць Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

«Таксама мы праінфармавалі Прэзідэнта аб тым, што сёння падрыхтаваны Працоўны кодэкс [змены для яго. — **«Зв.»**]», — сказаў Міхаіл Орда і дадаў, што прафсаюзы паведамілі пра сваё бачанне і ўнеслі прапановы па кароткатэрміновых кантрактах. Яны прапануюць наступнае: па волі наймальніка кантракт з работнікам можа быць заключаны на год толькі адзін раз, а ў далейшым — калі ёсць згода работніка і работадаўцы — кантракт павінен быць прадоўжаны на максімальны тэрмін. Прэзідэнт падтрымаў такую прапанову, хутка гэтыя пытанні могуць быць адрэгуляваны.

Яшчэ кіраўніка дзяржавы праінфармавалі па пытанні страхавання на выпадак банкруцтва або санацыі прадпрыемстваў, паколькі сёння прыкладна ў 40 % арганізацый, якія трапілі ў гэтыя працэсы, людзі пазбаўляюцца законнага заробку, а крыніца кампенсацый адсутнічае. Некаторыя прадпрыемствы не выплачваюць і ФСАН — а гэта непасрэдна ўплывае на пенсію людзей. Па словах старшыні Федэрацыі прафсаюзаў, Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапановы па гэтым пытанні. У хуткім часе гэта будзе адрэгулявана заканадаўча. Рашэнне гэтага пытання бачыцца так: стварыць спецыяльны страхавы фонд, які будзе браць на сябе нагрузку ў выпадку, калі ўзнікнуць пытанні, напрыклад, па страце заробку.

Гаварылі на нарадзе і аб праблемных арганізацыях. Прафсаюзы маніторацы сітуацыю на прадпрыемствах, дзе ёсць затрымка заработнай платы і іншыя складанасці. Раней Прэзідэнт даручаў высветліць, у чым праблема на кожным прадпрыемстве: можа, патрэбна мадэрнізацыя, можа, перанавучанне супрацоўнікаў. Кіраўніку дзяржавы былі ўнесены прапановы, што трэба рабіць з гэтымі арганізацыямі для стабілізацыі сітуацыі.

Яшчэ закранулі праблемныя раёны — Федэрацыя прафсаюзаў унесла прапановы беларускаму лідару па кожным з іх. Сутнасць у тым, каб распрацаваць выразны зразумелы план — як кароткатэрміновы, так і доўгатэрміновы, — што там павінна быць створана, хто і што павінен канкрэтна рабіць.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# Шукаць добрае ў гісторыі і адносінах

## Тэму будаўніцтва Беларускай атамнай станцыі вельмі палітызуюць у Літве

**Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з дэпутатам Еўрапейскага парламента, членам Камітэта па прамысловасці, навуцы і энергетыцы, экс-прэзідэнтам Літвы Раландасам Паксасам.**

Кіраўнік дзяржавы павітаў дэпутата Еўрапейскага парламента і адзначыў, што літоўскія палітыкі не часта наведваюць нашу краіну, каб пагаварыць аб праблемах, якія сёння існуюць паміж суседзямі.

Суседзяў не выбіраюць, заўважыў Аляксандр Лукашэнка, «яны ад Госпада», і трэба жыць як суседзям і ўступаць у дыялог.

«А каб жыць дружна і мірна, трэба мець зносіны і размаўляць на розныя тэмы, пачынаючы ад агульнай праблемы бяспекі ў гэтым рэгіёне, — а цяпер у нас у Еўропе штармізь і вельмі моцна. Дай бог, каб гэты шторм так і супакоіўся, — адзначыў Прэзідэнт. — З іншага боку, ёсць мясцовыя праблемы. Напрыклад, будаўніцтва атамнай станцыі — тэма, якая вельмі актуальная ў Літве і, як мы лічым, вельмі палітызаваная».

Прыезд Раландаса Паксаса Аляксандр Лукашэнка назваў добрай весткай з Літвы. «Я думаю, гэта будзе добрым пачаткам абмеркавання хоць бы тых праблем, якія паміж намі існуюць. А базіс, аснова, на якой мы можам будаваць нашы адносіны, — гэта заўсёды і ўсюды эканоміка, гандлёва-эканамічныя адносіны. Нягледзячы на палітычныя рознагалоссі, узровень вельмі высокі», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што Беларусь заўсёды з вялікім задавальненнем пастаўляла мільёны тон тавараў праз Літву, нашай краіне было камфортна працаваць у партах гэтай дзяржавы, на чыгуначных шляхах.

«І вельмі шмат нашых людзей з турыстычнымі мэтамі наведваюць Літву. Мы ніколі не перашкаджалі, каб літоўцы да нас прыязджалі. Слухайце, калісьці ж жылі разам, у адной дзяржаве. Трэба ў гісторыі шукаць нешта добрае, на што можна абаперціся. І ў нас гэтага дабра шмат. Давайце будзем шукаць гэта добрае, абапірацца на яго і будаваць у будучыні такія ж добрыя адносіны», — падкрэсліў Прэзідэнт.

* * *

Па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам Раландас Паксас падзяліўся падрабязнасцямі з журналістамі.

Яшчэ ў час размовы з кіраўніком дзяржавы ён адзначыў, што прыехаў у Беларусь па марай. Паводле слоў дэпутата, яна даволі сур'ёзная, і яе рэалізацыя можа працягнуцца даўжэй за чалавечае жыццё.

«Аснова — дэмілітарызаваць Калінінград і Літву, вось гэты рэгіён. Мяне хвалюе сітуацыя ў гэтым рэгіёне, я бачу, што ваенныя ястрабы — не важна, з якога боку — хацелі б пачаць вайну паміж ЗША і Расіяй менавіта ў гэтым рэгіёне. Я выступаю канкрэтна з іншага пункту гледжання: трэба пачаць будаваць адносіны зусім па-іншаму, супрацоўнічаць у культурнай сферы, эканамічнай, паміж універсітэтамі», — сказаў Раландас Паксас.

Такім чынам, дэпутат хоча, каб бяспека гэтага рэгіёна была гарантаваная дыпламатычнай сілай, а не ваеннай.

Іншая прычына візіту дэпутата Еўрапейскага парламента — Беларуская АЭС. Раландас Паксас прызнаў, што пэўныя сілы ў Літве — і не толькі Літве — выкарыстоўваюць будаўніцтва атамнай станцыі для дасягнення палітычных мэт.

«Я не думаю, што беларусы будавалі б сабе небяспечную электрастанцыю», — адзначыў экс-прэзідэнт Літвы.

Сябе ён назваў прыхільнікам атамнай энергетыкі і расказаў, як у бытнасць прэм'ер-міністрам Літвы яму давялося прымаць цяжкае рашэнне — закрыць першы блок атамнай станцыі. Такое жорсткае патрабаванне было агучана Еўрапейскім саюзам.

«Сюды я прыехаў, каб таксама паспрабаваць спыніць недавер — бяспечная гэтая станцыя або небяспечная. Я прапанаваў Прэзідэнту Лукашэнку стварыць самую магутную міжнародную экспертную групу з усіх краін, якія маюць вопыт (па гэтай тэме. — **«Зв.»**), можа быць, мелі і няшчасце», — расказаў Раландас Паксас.

Такая група, упэўнены дэпутат, дапаможа пераканаць людзей у бяспецы гэтага праекта. Ён таксама прызнаў, што станцыя будзе пабудавана і будзе працаваць. «Трэба ўсім зараз жа ісці насустрач, быць вельмі празрыстымі, каб як мага больш укласці ў бяспеку гэтай станцыі», — дадаў экс-прэзідэнт Літвы.

Раландас Паксас нагадаў, што пэўны час таму Літва мела тры прыярытэты замежнай палітыкі: стаць членам НАТА, стаць членам ЕС, а таксама мець добрыя адносіны з суседзямі.

«На жаль, з трэцім прыярытэтам не вельмі атрымалася. З-за многіх прычын, можа, з-за кіраўніцтва. Гэта трэба папраўляць», — падкрэсліў дэпутат.

Ён таксама адзначыў, што калі Бог дае суседа, з ім трэба жыць у міры і згодзе. Ёсць і іншы пункт гледжання: добрымі суседзяў робіць высокі плот паміж імі. Але дэпутат кіруецца менавіта першым прынцыпам.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Узровень

# Годныя пераможцы

**На плошчы Дзяржаўнага сцяга ў апошні дзень красавіка адбыўся мітынг, падчас якога адзначалі пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва па выніках работы за 2018 год. Ва ўрачыстай абстаноўцы ўшаноўвалі тыя прадпрыемствы і арганізацыі, якія дасягнулі найлепшых паказчыкаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця.**

Як адзначыў падчас мітынгу **першы намеснік прэм'ер-міністра краіны Аляксандр ТУРЧЫН**, мінулы год быў няпросты ў эканамічным плане. «Разам з тым нам удалося выканаць сем з васьмі ключавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця. Летась эканоміка краіны працягнула тэндэнцыю росту. Аб'ём валавога ўнутранага прадукту вырас на тры працэнты. За мінулы трохгадовы перыяд эканоміка вытрымлівае параметры, якія вызначаны праграмай пяцігодкі. Практычна ўсе ключавыя галіны забяспечылі эканамічны рост», — сказаў першы віцэ-прэм'ер. Паводле яго слоў, асноўным драйверам эканомікі застаецца прамысловасць.

Па выніках работы **за мінулы год на Рэспубліканскую дошку Гонару занесены 59 пераможцаў спаборніцтва**: адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі і прадпрыемствы. Сярод адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак найлепшымі прызнаны: горад Мінск, Гродзенская і Мінская вобласці. Сярод раёнаў былі адзначаны: Магілёўскі раён Магілёўскай вобласці, Астравецкі раён Гродзенскай вобласці, Мінскі раён Мінскай вобласці, Мазырскі раён Гомельскай вобласці і Брэсцкі раён Брэсцкай вобласці. Найлепшымі раёнамі ў гарадах былі абраны Савецкі і Першамайскі раёны Мінска, Ленінскі раён Брэста.

Трапілі на Дошку гонару буйныя прадпрыемствы, якія падпарадкоўваюцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання. Гэта завод аўтамабільных прычэпаў і кузаваў «МАЗ-КУПАВА», кампанія «БелАЗ» і акцыянернае таварыства «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман».

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ВАМ АДКАЖУЦЬ!

**Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 4 мая ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. Тэлефонныя лініі ў суботу з 9.00 да 12.00 праводзяць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатольеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Анатоль Аляксандравіч СІВАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

## Знешняя палітыка

# НОВЫ ПАСОЛ РАСІІ

### Дзмітрый Мезенцаў змяніў Міхаіла Бабіча на пасадзе кіраўніка дыпламатычнай місіі ў Мінску



**Адпаведны ўказ 30 красавіка падпісаў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін. Папярэднім указам у сувязі з пераходам на іншую работу ён вызваліў Міхаіла Бабіча ад абавязкаў Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла, а таксама спецыяльнага прадстаўніка Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю.**

Міхаіл Бабіч займаў сваю папярэднюю пасаду з 24 жніўня 2018 года. За гэты час ён запомніўся дастаткова неадназначнымі выказваннямі і пікіроўкамі з Міністэрствам замежных спраў Беларусі.

Да прызначэння ў Мінск Дзмітрый Мезенцаў быў членам Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі ад выканаўчай улады Сахалінскай вобласці. Да гэтага займаў пасаду генеральнага сакратара Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

**Паводле БелТА.**

# РОЛЯ АЎТАРЫТЭТНЫХ СМІ

### Убачыць дадатковую рэальнасць

— Асаблівасць сёлетняй выстаўкі СМІ ў тым, што мы прадстаўляем не толькі нашы інфармацыйныя рэсурсы — газету, часопіс, інтэрнэт-пляцоўкі. Мы ўпершыню ўзялі на сябе смеласць паказаць перадавыя тэхналогіі вырабу нашай інфармацыйнай прадукцыі, — расказаў **палкоўнік Андрэй САБАЛЕЎСКІ, начальнік ваеннага інфармацыйнага агенцтва «Ваяр»**. — Напрыклад, калі браць друкаваныя СМІ, то газета абмежавана плошчай, і сучаснаму маладому чалавеку сёння ўжо не так цікава проста прачытаць, убачыць здымак. Ён хоча акунуцца ў атмасферу. Таму мы актыўна выкарыстоўваем QR-коды — гэта дае магчымасць расшырыць плошчу газет віртуальна. Мы маем дадатковыя здымкі і іншыя матэрыялы, выкарыстоўваем праграму дадатковай рэальнасці.

### Іншых паглядзець і сябе паказаць

Даволі шырока прадстаўлены сродкі масавай інфармацыі з усіх абласцей краіны. Так, **рэдактар інтэрнэт-рэсурсу «Аршанскай газеты» Іна КАСІНЕЦ** расказала:

— Як заўсёды на такіх мерапрыемствах надзвычай прыемна ўбачыць сваіх калег, адшукаць знаёмых і наладзіць новыя кантакты. Мы звычайна звяртаем увагу на тое, што прывозіць кожная вобласць на выстаўку. Як яны рыхтуюцца, якія прадстаўляюць праграмы? Бо самі мы два мінулыя гады запар працавалі на ўласным стэндзе, рыхтавалі сваю праграму. Цікава ўбачыць, што ж робяць калегі? Натуральна, для кожнага журналіста гэта нармальны працэс — пастаянна сябе параўноўваць з іншымі, знаходзіць для сябе новыя ідэі. Таму тут, на выстаўцы, усё сабрана ў адным месцы як найлепш.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




### Надрукаваць старонку Біблії

На стэндзе «СМІ Брэстчыны», арганізаваным Брэсцкім аблвыканкамам, усе ахвотныя маглі паўдзельнічаць у віктарыне, прысвечанай стара даўняму гораду, які сёлета святкуе 1000-годдзе, — і атрымаць прыемныя прызы. Тут жа размясціўся запрошаны тэатр, які прадставіў касцюміраваную гісторыю.

— Стэнд адпраўляе ў XVI стагоддзе. Можна пачуць адпаведную музыку, убачыць урачыста апранутых Мікалая Радзівіла Чорнага з жонкай Альжбетай. Прадстаўлена і рэпліка станка, на якім госці друкуюць тытульныя аркушы Брэсцкай Біблії. Можна ўбачыць два тамы факсімільнага перавыдання Брэсцкай Біблії — Старога і Новага Запавету. Факсімільнае перавыданне зроблена ў Германіі ў пачатку 2000-х гадоў, і яно даволі рэдкае — такіх копій Брэсцкай Біблії ў Беларусі не больш за 10 асобнікаў, — адзначае адзін з удзельнікаў стэнду, **гісторык Антоній БОКУН**. — Такім чынам, на стэндзе «СМІ Брэстчыны» можна перанесціся на 500 гадоў назад, у часы Вялікага Княства Літоўскага.

* * *

3 мая на стэндзе Выдавецкага дома «Звязда» ў 12 гадзін адбудзецца паэтычная сустрэча з аўтарамі газеты «Літаратура і мастацтва». У 13 гадзін тут пройдзе майстар-клас ад заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Сяргея Волкава «Як малюецца карыкатура». З 14 да 15 гадзін можна далучыцца да акцыі «Падпішыся на часопіс «Вожык» — атрымай шарж» мастака-карыкатурыста Аляксандра Каршакевіча. У 16 гадзін — прэзентацыя кнігі Анатоля Бутэвіча «Таямніцы Нясвіжскага замка. Падарожжа ў глыб стагоддзяў з Уладзіславам Сыракомлем».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# ЯК АДСВЯТКАВАЛІ ПЕРШАМАЙ

**Песні і конкурсы, прафсаюзныя маёўкі і тэматычныя выстаўкі, лёгкаатлетычныя кросы і велапрабегі прайшлі ва ўсіх рэгіёнах краіны.**

На Аўгустоўскім канале, што **на Гродзеншчыне**, стартаваў міжнародны турыстычны сезон. Там пачаў працаваць пункт пропуску Лясная — Рудаўка, які прызначаны на веласіпедыстаў, воднікаў і пешых турыстаў. У самім Гродне адкрыўся купальны сезон і ўрачыста ўключылі фантаны.

Святочныя мерапрыемствы **ў Магілёве** пачаліся з урачыстасцяў на плошчы Леніна і ўручэння пасведчанняў аб занясенні на абласную Дошку гонару паводле вынікаў работы за 2018 год. На вуліцах і плошчах Магілёва, пачынаючы з 10 раніцы, праходзілі шматлікія забаўляльна-гульнявыя мерапрыемствы. Адбыўся парад прафесій, прысвечаны 115-годдзю прафсаюзнага руху Беларусі і Дню працы. У парку атракцыёнаў прафсаюзы запрашалі дзяцей пакатацца на каруселях бясплатна.

Сярод самых цікавых першамайскіх мерапрыемстваў **у Віцебску**: танцавальная пляцоўка для ветэранаў працы з удзелам духавога аркестра, народнае гулянне «Добры дзень, мір! Добры дзень, май!», акцыя сямейнага адпачынку «Мір. Праца. Май» і іншыя...

Сваё галоўнае свята адзначылі і прафсаюзы **Міншчыны**. Гэтым разам абласная маёўка прайшла ў горадзе Маладзечне. Урачыстасці адкрыла святочнае шэсце «Парад прафесій» галіновых прафсаюзаў Мінскай вобласці. Святочныя калоны прайшлі па вуліцы Віленскай да Цэнтральнай плошчы, дзе распачаўся мітынг «Славім чалавека працы» з ушанаваннем ветэранаў працы, найлепшых работнікаў, прафсаюзных актывістаў. Прадоўжыла свята музычнае віншаванне «Мелодыі Першамая».

Дзень працы **ў Гомелі** быў адзначаны акцыяй моладзі, якую прадстаўнікі Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў правялі для выхаванцаў Улукаўскай дапаможнай школы-інтэрната. Дзецям падарылі магчымасць неабмежавана катацца на атракцыёнах у гомельскім парку. Канцэртна-забаўляльныя праграмы праходзілі ва ўсіх раёнах горада.

**У Брэсце** галоўныя пляцоўкі святкавання разгарнуліся ў парку культуры і адпачынку, які раней быў названы ў гонар 1 Мая. Зранку адбылося ўрачыстае адкрыццё новага атракцыёна. З гэтай нагоды на ланцуговай каруселі першых наведвальнікаў таксама каталі бясплатна. Спадабаўся гараджанам і «Прафсаюзны вальс».

**Па матэрыялах уласных карэспандэнтаў «Звязды».**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пуцін падпісаў закон аб «суверэнным інтэрнэце»

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін у сераду падпісаў закон аб аўтаномнай рабоце інтэрнэту ў Расіі. Ён уступіць у сілу 1 лістапада.

Асноўная мэта новага закона, як дэкларуюць расійскія ўлады, — забяспечыць работу расійскага сегмента інтэрнэту нават у тым выпадку, калі яго адключаць ад агульнасусветнага сеціва.

Дзярждума ўхваліла дакумент 16 красавіка, а ўжо 22-га яго падтрымаў Савет Федэрацыі.

Адзін з аўтараў законапраекта Андрэй Клішас, выступаючы ў Савеце Федэрацыі, растлумачыў неабходнасць гэтага закона выпадкамі адключэння інтэрнэту ў розных краінах.

«Ці былі такія прыклады ў нас на тэрыторыі РФ? Паважаныя калегі, былі. Была абмежаваная работа на пэўны перыяд часу сайта Грамадскай палаты Расійскай Федэрацыі, таму што адзін з амерыканскіх інстытутаў — юрыдычных асоб, якія рэгулююць гэтую сферу, — палічыў, што ГП РФ звязаная з ДНР», — цытавала яго словы агенцтва Інтэрфакс.

### Трамп назваў чуткамі словы Пампеа пра тое, што Мадура хацеў пакінуць Венесуэлу

Прэзідэнта ЗША ў эфіры тэлеканала Fox Business папрасілі пракаментаваць інфармацыю пра тое, што кіраўнік Венесуэлы Мадура нібыта быў гатовы пакінуць рэспубліку на самалёце, але Масква ўгаварыла яго адмовіцца ад гэтай ідэі. «Калі гэта так, то гэта непрыемальна. Мы чуем мноства розных чутак. Былі чуткі, што ён збіраўся гэта зрабіць, былі чуткі, што ён пакінуў краіну. Я чую чуткі пра Расію, чую шмат пра Кубу», — адказаў прэзідэнт ЗША.

Раней у інтэрв'ю тэлекампаніі CNN дзяржсакратар Пампеа агучыў версію, паводле якой расійскія ўлады нібыта ўгаварылі Мадура не пакідаць краіну на самалёце ў аўторак. Паводле слоў дзяржсакратара, у кіраўніцтва ЗША была інфармацыя пра тое, што прэзідэнт Венесуэлы рыхтаваўся збегчы на Кубу. У адказ на гэтую заяву Мадура прапакнуў дзяржсакратара ў несур'ёзнасці.

Як паведаміла CNN, у сераду афіцыйны прадстаўнік МЗС Расійскай Федэрацыі Марыя Захарава, сцвярджэнні Пампеа наконт таго, што расійскія ўлады ўгаварылі Мадура не пакідаць краіну, не адпавядаюць сапраўднасці.

У Каракасе і шэрагу іншых гарадоў Венесуэлы апошнімі днямі прайшлі масавыя антыўрадавыя выступленні, якія пачаліся пасля таго, як група ваенных падтрымала лідара апазіцыі Хуана Гуайдо.

Дональд Трамп паабяцаў таксама, што «шмат чаго адбудзецца» на наступным тыдні. Але, магчыма, і раней, вакол сітуацыі па ўрэгуляванні канфлікту ў Венесуэле.

### Вучоныя прадказваюць поўнае знікненне атмасферы Плутона да 2030 года



Вынікі іх назіранняў, а таксама даныя, сабраныя міжпланетнай станцыяй New Horizons, якая ў ліпені 2015 года прайшла за 12,5 тыс. км ад Плутона і ўпершыню зрабіла яго здымкі, былі выкарыстаны для мадэлявання пораў года на планеце. Даследчыкам удалося атрымаць поўнае ўяўленне пра атмасферу Плутона, уключаючы яе шчыльнасць, ціск і тэмпературу.

Як нагадала CNN, тэмпература на планеце складае каля мінус 230 градусаў па Цэльсію. Яе атмасфера складаецца ў асноўным з азоту, метану і монааксіду вугляроду.

«Даследаванне паказала, што, калі Плутон знаходзіцца далей за ўсё ад Сонца і ў яго паўночным паўшар'і надыходзіць зіма, азот у атмасферы вымярзае», — прыводзіць тэлеканал словы аўтара навуковага праекта дацэнта ўніверсітэта Тасманіі Эндру Коўла. «Па нашых прагнозах, да 2030 года атмасфера вакол усёй планеты вымерзне і знікне», — дадаў вучоны. Знікненне атмасферы Плутона можа прывесці да таго, што ён будзе адбіваць больш сонечнага святла і здавацца жыхарам Зямлі больш яркім.

## Сугучча

### «КЛЮЧАВЫЯ КАНЦЭПТЫ...»: НОВЫ КІТАЙСКІ ПРАЕКТ

**У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча з дэлегацыяй Выдавецтва метадычнай і навуковай літаратуры Пекінскага дзяржаўнага ўніверсітэта замежных моў.**

У рабочай сустрэчы з беларускага боку прынялі ўдзел міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч, намеснік міністра Ігар Бузоўскі, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак. На пачатку размовы абмяркоўвалася рэалізацыя праекта па выданні серыі кніг «Ключавыя канцэпты кітайскай думкі і культуры». Першая кніга (а ўсяго мяркуецца выдаць дзевяць зборнікаў), якая носіць падзагаловак «Прэса па даследаванні і вывучэнні замежных моў», ужо пабачыла свет на беларускай і кітайскай мовах у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Перакладчыкі — Вольга Гальпяровіч, Раман Несцяровіч.

Таксама падчас рабочай сустрэчы, як пра перспектыву на заўтра, абодва бакі вялі гаворку аб стварэнні рэдакцыі кітайскай літаратуры ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Кітайскія выдаўцы засведчылі і сваю цікаўнасць да прадстаўлення ў КНР беларускай мастацкай літаратуры. У сувязі з гэтым яны чакаюць аўтарытэтных, экспертных падказак з беларускага боку.

У праграме візіту кітайскай дэлегацыі — рабочыя перагаворы ў выдавецтвах «Народная асвета», «Вышэйшая школа», «Адукацыя і выхаванне», Выдавецкім доме «Звязда».

**Сяргей ШЫЧКО.**

## Надвор'е

### ДАЖДЖУ ДАЧАКАЛІСЯ...

У найбліжэйшыя дні, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца пад уплывам атмасферных франтоў, чакаецца няўстойлівае надвор'е з тэмпературным фонам крыху ніжэй за кліматычную норму, аднак па поўдні краіны будзе прыгравацца да плюс 22 градусаў.

Сёння ўдзень надвор'е будзе вызначаць атмасферны фронт. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, раніцай і ўдзень з парывістым ветрам, днём па паўднёвым усходзе магчымы навальніцы. Тэмпература паветра будзе 11—17 градусаў цяпла, па паўднёвым усходзе паветра прагрэецца да плюс 20 градусаў. У суботу наша краіна апынецца пад уплывам прахалоднай няўстойлівай паветранай масы. Уначы па паўднёвым усходзе, а раніцай і ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, у некаторых раёнах чакаюцца замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. Удзень будзе ад плюс 11 да плюс 17 градусаў, па паўднёвым усходзе — да плюс 19 градусаў.

У першы дзень вялікіх выхадных надвор'ем будуць кіраваць атмасферныя франты. Чакаецца пераважна воблачнае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны ў нядзелю пройдуць дажджы, днём месцамі па паўднёвым усходзе навальніцы, якія будуць суправаджацца парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 цяпла, па поўдні — плюс 9—10 градусаў. Удзень будзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, па паўднёвым усходзе — 15—22 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак атмасферны фронт абумовіць на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 цяпла. Удзень будзе ад плюс 8 да плюс 14 градусаў, месцамі — да плюс 17 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «У ПЕСНЯХ ТРЭБА КОЖНЫ РАЗ УКЛЮЧАЦЬ ДУШУ І СЭРЦА»



1971 год, чацвёрты курс кансерваторыі. Між іншым, у Ядвігі Паплаўскай — два кансерваторскія дыпломы, але яна не завастрае на гэтым увагі: «Можна мець і дзве, і тры адукацыі, але дзякаваць трэба перш за ўсё тату і маме ды яшчэ Богу, які даў слых».

***— Ядвіга Канстанцінаўна, сёлета вы былі сустаршынёй на прэстыжным вакальным конкурсе «Маладзічок». Што «чапляе», бярэ за душу вас у сучасных юных артыстах, а чаго ім, магчыма, бракуе?***

— Залогам поспеху, перамогі на конкурсах з'яўляюцца працалюбства і вялікае жаданне выступаць на сцэне — не толькі з боку бацькоў і педагогаў, але і з боку самога юнага выканаўцы. Скажам, што датычыцца «Маладзічка», мне гэты конкурс прынёс неверагоднае задавальненне — настолькі душэўнай і цёплай была атмасфера, настолькі высокі ўзровень таленту і падрыхтоўкі паказвалі ўдзельнікі, а гэта дзеці і моладзь ад 6 да 19 гадоў. У кожным выхадзе канкурсантаў былі відаць вялікая праца і майстэрства нашых цудоўных педагогаў і творчая самааддача дзяцей. Выдатныя вакальныя даныя, патэнцыял — гэта ўсё адчуваецца, але найбольш моцнае ўражанне, канешне, пакінулі тыя дзеці, у якіх ёсць, акрамя таго, пэўная артыстычная харызма...

Наогул, конкурсы — рэч абсалютна неабходная для артыста. Бо сёння, як і ў мінулы час, яны выяўляюць найлепшых, раскрываюць магчымасці і ўдасканальваюць здольнасці ўдзельнікаў. Гэта штуршок для таго, каб ісці наперад. На тым жа «Маладзічку» ў дзецях, якіх я бачу на розных конкурсах не першы год, быў відавочны не толькі прафесійны рост, але і разуменне, ці твая гэта справа. Бо, паверце, прафесіяналы бачаць, з якой прычыны юны выканаўца стаіць на сцэне: ці гэта патрэбна яму, ці гэта рэалізацыя бацькоўскіх амбіцый альбо педагогаў. І ўстаноўка «Ты самы лепшы, ты зорка», якую даюць сваім дзецям многія бацькі, на мой погляд, толькі нашкодзіць — яна перашкаджае аб'ектыўна ацаніць сябе.



З Аляксандрам Ціхановічам яны прайшлі ў творчым і сямейным дуэце больш за 40 гадоў. У 2011-м павянчаліся. І здаецца, нават пасля яго адыходу ў 2017-м не расталіся, бо прырaслі адно да аднаго ўсёй скурай, усёй душой. Сёння народная артыстка шмат працуе над новымі аранжыроўкамі ранейшых шлягераў: «Я стараюся захаваць кожную Сашаву песню, каб яны жылі далей».

***— Часта даводзілася чуць ад арганізатараў дзіцячых конкурсаў, што многія юныя артысты ці іх педагогі памыляюцца з выбарам рэпертуару і бяруць песню не па ўзросце, што таксама псуе ўражанне...***

— Так, гэта сапраўды распаўсюджаная праблема. Педагог можа ўзяць занадта складаны твор, які дзіця не разумее. Але ж кожнае слова, якое гучыць са сцэны, мусіць прайсці праз галаву, праз душу, праз сэрца. А калі яно праходзіць міма, то ўражанне губляецца, артыст спявае бездакорна, але не знаходзіць водгуку ў слухачоў. Нават калі ты добра спяваеш, але не маеш артыстычнай жылкі, адухаўлёнасці, — такое выкананне не кранае, якія б ні былі тэхнічныя вакальныя магчымасці, правільнае інтанаванне, абсалютны слых і гэтак далей. Бывае наадварот: харызматычнае дзіця, ёсць дыяпазон, ёсць даныя і тэмбр сімпатычны, — а спявае фальшыва, інтанацыя кульгае. Бывае, ёсць і тое, і другое — і вакальныя магчымасці, і артыстызм, — але перашкаджае выбар рэпертуару альбо няправільна падабраная аранжыроўка. Яркі прыклад — «Малітва» Алега Молчана на вершы Янкі Купалы, якую выконваў на конкурсе Ваня Ларчанка. Ён атрымаў першую прэмію — нягледзячы на тое, што аранжыроўка песні была няўдалая, бо не ўлічвала неабходныя для зручнага вакальнага выканання моманты, не было нават дзе ўдыхнуць; але пры гэтым у яго голасе, у падачы «Малітвы» было самае галоўнае: ён разумеў і адчуваў, пра што і для чаго спявае, ён сапраўды маліўся.

А што датычыцца ўвогуле самых распаўсюджаных памылак, такіх як пэўныя хібы ў інтанацыі, некаторая заціснутасць на сцэне, — гэта ўсё выпраўляецца з часам, з набыццём вопыту публічных выступленняў, падчас чаго, уласна, артыст і становіцца артыстам.

***— А калі конкурсны вопыт доўгі час адмоўны, адкуль набрацца сіл ісці далей?***

— Каб не схіліцца пад грузам няўдач, а развівацца і самаўдасканальвацца, патрэбны правільны настрой. Паўтаруся, самае горшае, што можна зрабіць, — укласці дзіцяці ў галаву перакананне «Ты «зорка», ты найлепшы». Так, трэба верыць у свае сілы — але нельга сябе пераацэньваць. Калі потым выяўляецца, што ты не самы лепшы, — каб вы ведалі, колькі ў вачах дзяцей расчаравання! Але нават калі ты не атрымаў гэтую прэмію і той дыплом, у цябе засталося самае галоўнае — вопыт удзелу ў конкурсах, разуменне сваіх памылак. Трэба прымаць любыя вынікі, і прымаць іх з радасцю, бо гэта неацэнная сцэнічная школа. У рэшце рэшт, у час зразумець, што, мабыць, табе варта ісці па іншым шляху, — таксама каштоўна. Напрыклад, калі ў цябе ёсць артыстычныя здольнасці, але кульгае інтанацыя, можна адысці ад эстраднага вакалу, а паспрабаваць сябе ў тэатры — сёння выбар даволі разнастайны. І канешне, не трэба прымушаць, калі дзіця не жыве сцэнай, — гэта не прынясе плёну, хутчэй, наадварот. Помню, бачыла ў восьмым класе музычнай школы хлопчыка-інструменталіста — не скажу зараз дакладна, граў ён на домбры ці балалайцы, але так класна граў! І ні ў якую не пагаджаўся ісці вучыцца далей, бо лічыў, што музыка нічога не дасць у матэрыяльным плане, і выбраў іншы шлях, насуперак просьбам бацькоў і педагога.

...Калі вярнуцца зноў на 45 гадоў таму, то ў савецкі час перамога на прэстыжных конкурсах была сапраўды лёсавызначальнай. Стаў лаўрэатам — атрымаеш «зялёнае святло» на тэлебачанні (у прыватнасці, «Верасоў» па-сяброўску падтрымлівалі знакаміты спявак Віктар Вуячыч і кампазітар Яўген Глебаў, калектыў стаў заўсёднікам перадач «Блакітны агеньчык» і «Песня года» — па сутнасці, галоўнага хіт-парада СССР), табе дапамогуць запісаць першую пласцінку, над тваім рэпертуарам будуць працаваць вопытныя кампазітары і паэты-песеннікі, адшліфоўваючы кожную фразу, — словам, уся індустрыя тагачаснай эстрады працавала на раскрутку маладых талентаў... Магчыма, гэта тое, чаго не хапае сучаснаму шоў-бізнесу, каб нашы юныя таленты не растваραліся ў замежных калідорах або, адвучыўшыся ці набраўшыся працоўнага вопыту, усё ж вярталіся працаваць на радзіму — ведаючы, што іх тут чакаюць і гатовыя падтрымаць на творчым шляху?

...Мабыць, каб захаваць і працягнуць гэту традыцыю — дапамагаць маладым выканаўцам прабіцца на вялікую сцэну, як некалі дапамаглі вопытныя калегі ім самім, — у 1989 годзе Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч заснавалі Тэатр песні, які з цягам часу ператварыўся ў прадзюсарскі цэнтр. Менавіта тут пачыналі свой творчы шлях заслужаныя артысты Беларусі Іна Афанасьева, Уладзімір Радзівілаў, Аляксандр Саладуха, артыст тэатра, кіно і эстрады Георгій Волчак і многія іншыя. Новыя імёны на эстрадзе з'явіліся і дзякуючы праектам прадзюсарскага цэнтра на тэлебачанні — «Поп-ТВ», «Беларусь збірае сяброў», «Зорны дыліжанс», «Хіт-момант», «ЕўраФэст». Прадзюсарскі цэнтр дзейнічае і сёння: акрамя прафесійнай студыі гуказапісу, тут працуе дзіцячая вакальная школа «Белы парус», навучэнцы якой удзельнічаюць у розных канцэртах і конкурсах.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з асабістага архіва спявачкі.**

***P. S.*** Так сталася, што гэта інтэрв'ю выходзіць у дні, калі Ядвіга Паплаўская адзначае юбілей, хоць мы адмыслова не «прывязваліся» да гэтай даты і не гаварылі з народнай артысткай пра ўзрост, творчыя вехі і далейшыя планы. Але ў такім выпадку грэх не скарыстацца нагодай. «Звязда» шчыра зычыць толькі самага найлепшага, моцнага здароўя, творчага плёну, удзячнай публікі і чалавечага шчасця Ядвізе Канстанцінаўне — гаспадыні нашай любімай «Калыханкі», «Жанчыне года — 2018» у намінацыі «Духоўнасць і культура», вытанчанай і адначасова моцнай жанчыне, якая стала без перабольшання сімвалам беларускай эстрады. Хіба хто дасць веры, што ёй 70?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

- у 1974-м трэцюю прэмію Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады падзялілі два інструментальныя ансамблі — «Верасы» і «Арміна», у якім у той час спявала Ларыса Доліна. Сярод іншых удзельнікаў, хто стаяў на сцэне ў той год, — Ала Пугачова і Рэнат Ібрагімаў, ВІА «Арыэль» і «Самацветы», Генадзь Хазанаў і многія іншыя;
- праз некалькі гадоў, у 1977-м, адбылося тэлевізійнае спаборніцтва маладых выканаўцаў «З песняй па жыцці», пасля перамогі ў якім пра «Верасоў» ужо ведаў без перабольшання ўвесь Савецкі Саюз. Спявалі беларусы, між іншым, дзівосна прыгожую кампазіцыю «Пахне чабор» Валерыя Іванова на вершы Петруся Броўкі;
- у 1988-м Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, якія пакінулі ансамбль, ужо ў дуэце пад назвай «Шчаслівы выпадак» выступілі з аднайменнай песняй (музыка Эдуарда Ханка, словы Ларысы Рубальскай) у конкурсе «Песня года — 88» — і перамаглі!



Яна ўжо даўно магла б напісаць мемуары, як насамрэч пачыналіся і чым жылі «Верасы». Магла б, але не робіць гэтага — не таму, што няма чым адказаць на чужыя домыслы, а таму, што лічыць гэта надзвычай складанай і вялікай працай: «Калі пісаць, то трэба пісаць пра кожнага ўдзельніка, бо ўсе мы аддалі ансамблю частку сябе».



Цяжка падлічыць дакладна, колькі артыстаў-пачаткоўцаў атрымалі ў свой час дапамогу, падтрымку, слушную прафесійную параду ад Ціхановіча і Паплаўскай. Тым больш праца з талентамі працягваецца і сёння — напрыклад, на конкурсе «Маладзічок-2019» Ядвіга Паплаўская была сустаршынёй журы.




## НОЧ ПЕРАД КУПАЛЛЕМ

Нас, неразлучных сябровак, было чацвёра. І жылі мы амаль па суседстве, і вучыліся ў адным класе, хоць узрост быў розны: у пасляваенным 1946-м у першы клас пайшлі і тыя, каму сем, і тыя, каму дзесяць, а то і адзінаццаць...

Такой вось дружнай чацвёркай мы памалу і раслі, не адчувалі, можна сказаць, розніцы, але ж потым самая старэйшая з нас, Зіна, стала пакрысе аддаляцца. У клубе яна ўжо танцавала з хлопцамі (нас, малых, яшчэ ніхто не запрашаў), і потым аж да самай хаты яе стаў праводзіць Іван. Ну, добра б адзін раз ці два, а то ўжо каторы месяц... «Цікава, а пра што яны гавораць?» — прамовіла неяк адна з сябровак. «А давайце следам за імі пойдзем ды паслухаем», — тут жа падхапіла другая. «Не, — запярэчыла трэцяя, — найлепей затаіцца ды пачакаць, калі яны спыняцца, калі на лавачку сядуць...»

Як прыдумалі, так і зрабілі: пасля кіно засталіся на танцах, але да канца не дабылі: збеглі загадзя, асцярожна пракраліся ў Зінін гарод. Там, каля самага плота, за нейкі, можа, метр-другі ад лавачкі абтапталі крапіву ды малады сліўняк і заселі.

Даўгавата прыйшлося чакаць, але ж нарэшце пачуліся галасы, з'вілася парачка і спынілася каля лаўкі. Стоячы там, Зіна з Іванам абмяркоўвалі кіно, якое сёння прывозіла кінаперасоўка, потым Ваня расказваў пра кнігу, што брат прывёз яму з горада, потым загаварылі пра тое, што заўтра добра было б пад'ехаць на станцыю і прадаць трохі чарніц... «Іх жа назбіраць яшчэ трэба», — уздыхнула Зіна і стала рвацца дамоў. Іван не адпускаў... Тады яна сказала, што ёй пара, што яна ўжо змерзла... Ён, відаць, аддаў ёй пінжак, бо Зіна падзякавала за цёплую рэч... Пасля гэтага паміж імі пачалася нейкая валтузня: хлопец, мусіць, рваўся абняць яе, але Зіна ўсё вырывалася і нарэшце ўцякла, бо з двара пачулася яе: «Бывай!.. Да заўтра!»

Аднак Іван сыходзіць не спяшаўся. Ён трохі пастаяў ля лавачкі, потым пасядзеў на ёй (можа, чакаў, што сяброўка вернецца?), потым устаў...

Мы, за плотам, «ураслі», здаецца, у зямлю, бо побач, можна сказаць, каля нашых вушэй пачуліся крокі (адзін, другі, трэці...) і амаль тут жа сціхлі. Ваня, відаць, спыніўся? І раптам... Па крапіве, па сліўняку ўдарыў моцны струмень, з шумам палілося нешта цёплае...

— Фу-у, — грэбліва гукнула Ева і, падхапіўшыся, віхрам панеслася ў бок гарода. Мы штосілы пабеглі за ёй.

Не заўважылі, як апынуліся ў суседнім двары. Ад яго ўжо рукою падаць да вуліцы... І тут... «Гэй, вы хто?», — з ганка сваёй хаты наперарэз нам спускаўся дзед Алесь. Шлях наш быў канчаткова адрэзаны.

Прыйшлося рэзка развярнуцца і дацца ў бок хлява, потым, не чуючы ног, па бульбе, выбегчы на поплаў і толькі там ужо даць волю пачуццям — дзіка зарагатаць...

Гэта было перад самым Купаллем і позна ўвечары, а раніцу калгасніцы выйшлі абсякаць капусту, і Алесіха (жонка дзеда) адразу ж стала ўсім расказваць, як яе чалавек ноччу выйшаў на падворак пакурыць, як на свае вочы ўбачыў там трох... вядзьмарак. З'явіліся яны раптам, немаведама адкуль... Усе тры былі з доўгімі распушчанымі валасамі, абсалютна... голыя... Ішлі, маўляў, на вуліцу, на вёску, а варта было дзеду азвацца — іх нібы ветрам садзьмула, — растварыліся!

